Аляксандар Ціхаміраў

# БЕЛАРУСЬ У ВОНКАВАЙ ПАЛІТЫЦЫ РАСІІ

Спэцыфіку падыходаў кіраўніцтва Расіі да разьвіцьця супрацоўніцтва зь Беларусяй нельга зразумець без азнаямленьня зь яго агульнымі падыходамі да разьвіцьця супрацоўніцтва з рэспублікамі былога Саюзу ССР, якія ў 1991 г. стварылі Садружнасьць Незалежных Дзяржаваў. У 1990—1991 гг., калі кіраўніцтва РСФСР вяло барацьбу за ўладу з кіраўніцтвам СССР, расійскія кіраўнікі без асаблівых ваганьняў прызнавалі сувэрэнітэт саюзных рэспублік, разглядаючы іх як саюзьнікаў у барацьбе супраць саюзнага Цэнтру. У студзені 1991 г. Старшыня Вярхоўнага Савету РСФСР Б. Ельцын заявіў: “Мы... ускладаем вялікія спадзяваньні на супрацоўніцтва Беларусі, Украіны, Казахстану і Расіі, рыхтуем чатырохбаковае пагадненьне па ўсіх сфэрах жыцьця і, спадзяюся, хутка падпішам яго ў Менску. Мы, чатыры рэспублікі, маем намер каардынаваць свае дзеяньні. Зразумела, у нас бываюць невялікія разыходжаньні ў пазыцыях, але яны непрынцыповага характару. Лічу, што нашы рэспублікі вельмі блізкія ў поглядах на будучыню. Калі мы моцна аб’яднаемся, дык істотна паўплываем на ўсю сытуацыю ў краіне”[1].

Аднак у жніўні 1991 г. сытуацыя ў СССР рэзка зьмянілася. З паразай жнівеньскага путчу адбывалася дэзінтэграцыя прасторы савецкай дзяржавы. Расія, якая адыграла вырашальную ролю ў ліквідацыі ГКЧП СССР, фактычна сканцэнтравала ў сваіх руках функцыі ўлады Саюзу. Падтрымка саюзных рэспублік, якія станавіліся ўсё больш незалежнымі, ёй была больш непатрэбная. Больш за тое, далейшае захаваньне Саюзу ССР расійскія палітыкі лічылі справай шкоднай. Напрыклад, дзяржсакратар РСФСР Генадзь Бурбуліс у верасьні 1991 г. у дакумэнце “Стратэгія Расіі ў пераходны перыяд” пісаў: “Аб’ектыўна Расіі не патрэбны эканамічны цэнтар, які будзе стаяць над ёй і займацца пераразьмеркаваньнем ейных рэсурсаў. Аднак у такім цэнтры зацікаўленыя шмат якія іншыя рэспублікі. Паставіўшы пад кантроль уласнасьць на сваёй тэрыторыі, яны імкнуцца праз саюзныя органы пераразьмяркоўваць на сваю карысьць уласнасьць і рэсурсы Расіі. Паколькі такі цэнтар можа існаваць толькі пры падтрымцы рэспублік, ён аб’ектыўна, незалежна ад свайго кадравага складу, будзе праводзіць палітыку, якая будзе супярэчыць інтарэсам Расіі”[2].

Адпаведныя падыходы адыгралі вырашальную ролю пры ліквідацыі СССР і

стварэньні Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў у сьнежні 1991 г., прычым расійскае кіраўніцтва адчувала нават задавальненьне ад пастановаў, прынятых у Белавескай пушчы. "...Там, у Белавескай пушчы, раптам прыйшло адчуваньне нейкай свабоды, легчыні, — успамінаў пазьней прэзыдэнт Расійскай Фэдэрацыі Барыс Ельцын. — Падпісваючы гэтае пагадненьне, Расія выбірала іншы шлях разьвіцьця. Рэч была ня ў тым, што ад цела былой імпэрыі аддзяляліся стагодзьдзі назад заваяваныя і далучаныя часткі. Культурная, бытавая, эканамічная і палітычная інтэграцыі рана ці позна зробяць сваю справу — і гэтыя часткі ўсё роўна застануцца ў зоне нашага супольнага супрацоўніцтва. Расія ўступала на мірны, дэмакратычны, не імпэрскі шлях разьвіцьця. Яна выбірала новую глябальную стратэгію. Яна адмаўлялася ад традыцыйнага вобразу "ўладальніцы паўсьвету", ад узброенага супрацьстаяньня з заходняй цывілізацыяй, ад ролі жандара ў вырашэньні нацыянальных праблемаў"[3].

Легчыня, зь якой расійскія кіраўнікі ішлі на ліквідацыю СССР, тлумачылася іх упэўненасьцю ў тым, што былыя саюзныя рэспублікі застануцца ў складзе новага міждзяржаўнага ўтварэньня, дзе Расія адыгрываецьме ролю лідэра. Так, расійскі палітоляг Андранік Мігранян пісаў у сьнежні 1991 г.: "Пагадненьне, падпісанае ў Белавескай пушчы, наўрад ці ставіць кропку ў справе развалу старога Саюзу. Зусім верагодна, што яшчэ ня вычарпаныя магчымасьці захаваньня ядра адзінай дзяржавы ў абход цэнтру і новаагароўскага працэсу. Якімі яны могуць быць? Гэта залежыць ад узаемаадносінаў паміж чатырма рэспублікамі: Расіяй, Украінай, Беларусяй і Казахстанам. Характар гэтых адносінаў можа быць вызначаны толькі на аснове двухбаковых пагадненьняў. Калі б Расія і Беларусь змаглі дамовіцца аб стварэньні адзінай фэдэрацыйнай дзяржавы зь вельмі шырокай унутранай аўтаноміяй... гэтае пагадненьне дазволіла б пераадолець падазронасьць і недавер да Расіі з боку ўкраінцаў. Просты здаровы глузд падказвае, што доўгатэрміновыя інтарэсы Расіі, Украіны і Беларусі ляжаць у адной плашчыні. /.../ Пры такім разьвіцьці адносінаў паміж Расіяй, Беларусяй і Ўкраінай у Казахстану не застаецца іншага выбару, як або ўвайсьці ў фэдэрацыйныя адносіны з Фэдэрацыяй Расія — Беларусь, або быць узарваным знутры. Што ж датычыць лёсу іншых рэспублік, то яны могуць уступаць у адносіны з гэтым новым дзяржаўным утварэньнем на роўных умовах"[4].

Аднак даволі хутка кіраўнікі Расіі зь зьдзіўленьнем убачылі, што новыя дзяржавы на постсавецкай прасторы не жадаюць безумоўна прызнаваць лідэрства Расіі, а некаторыя зь іх наагул хочуць выйсьці са складу СНД. Само жыцьцё неадкладна патрабавала распрацоўкі канцэпцыі разьвіцьця СНД і наладжваньня адносінаў з асобнымі дзяржавамі Садружнасьці. Гэтым займаліся супрацоўнікі МЗС РФ, а таксама вядучыя расійскія інтэлектуальныя асяродкі, якія спэцыялізаваліся на праблемах міжнародных адносінаў (найперш спэцыялізаваныя інстытуты Расійскай акадэміі навук і недзяржаўная Рада па вонкавай і абароннай палітыцы (РВАП), якая была створаная ў 1992 г.).

Першыя тэарэтычныя дакумэнты, дзе фармулявалася пазыцыя Расіі да СНД,





зьявіліся ў 1992 г. У жніўні 1992 г. "Независимая газета" апублікавала тэзысы "Стратэгія для Расіі". У дакумэнце адзначалася, што пасьля распаду СССР Расія апынулася ў складаным становішчы, паколькі вакол яе стварыўся "пояс нестабільнасьці". Аўтары тэзысаў лічылі, што аптымальным курсам што да постсавецкіх дзяржаваў ёсьць "асьвечаны" постімпэрскі інтэграцыянісцкі курс у розных варыянтах", які б адкідаў як нерэалістычную і контрапрадукцыйную мэту новае і хуткае аб'яднаньне постсавецкіх дзяржаваў у Саюз. "Галоўнай мэтай (постімпэрскай) палітыкі павінна стаць пазьбяганьне дастаткова верагодных войнаў і канфліктаў, кіраваньне трансфармацыяй былога СССР. У якасьці доўгатэрміновай апэратыўнай мэты ён [курс] можа мець стварэньне жыцьцяздольнай супольнасьці накшталт ЭС, гэта значыць рэінтэграцыю значнай часткі былога СССР на прымальных для ўсіх дзяржаваў умовах", — пісалі яны[5].

Складальнікі "Стратэгіі для Расіі" лічылі мэтазгодным захаваньне СНД, адзначыўшы, што "пры ўсёй вымучанасьці і ўмоўнасьці формулы СНД яна дазваляе, няхай на сымбалічным узроўні, фіксаваць рэальнае адзінства інтарэсаў мільёнаў людзей, якія насяляюць прастору былога Саюзу, і адначасова пакідае адчыненымі дзьверы да пошуку новай, яшчэ незразумелай канфігурацыі структуры арганічнага супрацоўніцтва тых рэгіёнаў і тэрыторыяў, якія аб'ядналіся некалі ў адзіную Расійскую дзяржаву"[6]. Таксама яны заклікалі стварыць сетку сталых міждзяржаўных органаў, якія б рэгулявалі адносіны ў такіх сфэрах жыцьця, як эканоміка, транспарт, энэргетыка, фінансы, адукацыя, культура, абарона, падкрэсьліўшы, што адпаведныя органы будуць папярэджваць і зьмякчаць канфлікты, зьмякчаць наступствы разрыву сувязяў, дапамагаць фармаваньню асабістых кантактаў, асабістай зацікаўленасьці ў іх працягу новых элітаў[7].

У канцы 1992 г. супрацоўнікі МЗС РФ распрацавалі праект канцэпцыі вонкавай палітыкі Расійскай Фэдэрацыі. У дакумэнце адзначалася, што стратэгічнай мэтай расійскай палітыкі што да СНД ёсьць фармаваньне "поясу добрасуседзтва". Яны зьвярталі ўвагу на неабходнасьць спалучэньня фармаваньня новых адносінаў з краінамі "блізкага замежжа" з нарошчваннем шматбаковых формаў узаемадзеяньня, а таксама на мэтазгоднасьць "разнахуткаснага" падыходу да формаў арганізацыі і функцыянаваньня СНД[8].

Пасьля дапрацоўкі ў красавіку 1993 г. праект канцэпцыі ў выглядзе Асноўных палажэньняў канцэпцыі вонкавай палітыкі РФ зацьвердзіла расійская Рада бясьпекі. У адпаведным дакумэнце ў параўнаньні зь першапачатковым варыянтам рабіўся больш моцны акцэнт на падтрыманне цэльнасьці прасторы былога СССР (за выняткам краінаў Балтыі). Галоўным зьместам расійскай вонкавай палітыкі разам з задачай захаваньня яе пазыцыяў як вялікай дзяржавы абвяшчалася наладжваньне ўстойлівых пазытыўных узаемаадносінаў з краінамі СНД дзеля пераадоленьня дэзінтэграцыйных працэсаў на тэрыторыі былога СССР, забесьпячэньня прыярытэтных вайскова-палітычных і эканамічных інтарэсаў Расіі. Дзеяньні, накіраваныя на падрыў інтэграцыйных працэсаў у СНД, былі занесеныя ў лік асноўных палітычных пагрозаў і выклікаў бясьпецы Расіі. У

якасьці аднаго з жыцьцёва важных інтарэсаў Расіі разглядалася рэалізацыя правоў і інтарэсаў нацыянальных меншыняў — прадстаўнікоў народаў Расійскай Фэдэрацыі ў краінах былога СССР[9].

Што да СНД Асноўныя палажэньні канцэпцыі вонкавай палітыкі РФ 1993 г. ставілі наступныя задачы:

— дасягненьне максымальна магчымай ступені інтэграцыі былых саюзных рэспублік ува ўсіх галінах іх жыцьцядзейнасьці на прынцыпах строгай добраахвотнасьці і ўзаемнасьці пры імкненьні, у выпадку негатоўнасьці тых ці іншых бакоў да супрацоўніцтва на асобных кірунках, разьвіваць узаемадзеяньне з вузейшым колам зацікаўленых дзяржаваў;
— разьвіцьцё ўсебаковага супрацоўніцтва ў вайскова-палітычнай сфэры ў мэтах стварэньня эфэктыўнай сыстэмы калектыўнай бясьпекі;
— забесьпячэньне статусу РФ як адзінай ядравай дзяржавы на тэрыторыі былога СССР;
— умацаваньне вонкавых межаў Садружнасьці;
— урэгуляваньне пытаньняў пра статус расійскіх войскаў і пра вайсковыя базы Расіі на тэрыторыі краінаў былога СССР;
— захаваньне вайсковай інфраструктуры і аб’ектаў, якія складаюць цэльную сыстэму забесьпячэньня ваеннай бясьпекі Расіі;
— прадухіленьне эскаляцыі ўзброеных канфліктаў у “блізкім замежжы”, перашкоды спробам трэціх краінаў выкарыстаць палітычную нестабільнасьць у сваіх мэтах;
— умацаваньне міратворчага мэханізму з удзелам РФ, у тым ліку на аснове мандату ААН ці НБСЭ[10].

У траўні 1994 г. у “Независимой газете” зьявіліся новыя тэзысы РВАП (“Стратэгія для Расіі-2”), якія былі скарэгаваныя з улікам зьмяненьняў у міжнароднай сытуацыі. У тэзысах зьвярталася ўвага на тое, што ў бальшыні краінаў “блізкага замежжа” складваецца “якасна новая сытуацыя”, якая вызначаецца пераменай настрояў на карысьць інтэграцыі. Аўтары дакумэнту адзначалі, што ў Расіі застаецца адна альтэрнатыва: альбо курс на ўзьяднаньне са значнай часткай рэспублік былога СССР ці, у выпадку іх дэзінтэграцыі, зь іх рэгіёнамі й стварэньне новай фэдэрацыйнай дзяржавы, альбо курс на захаваньне палітычнай незалежнасьці гэтых дзяржаваў у абмен на атрыманьне неабмежаванага доступу на іх рынкі тавараў, паслуг, капіталаў, на стварэньне эфэктыўнага абарончага ваенна-палітычнага саюзу, забесьпячэньне адзінай прававой прасторы для ўсіх нацыянальных меншыняў, якая б забясьпечыла іх паўнавартасныя правы[11].

Чальцы РВАП уважалі, што Расія павінна не аднаўляць з мадыфікацыямі становішча, якое існавала да развалу СССР, а мадэрнізаваць адносіны з постсавецкімі дзяржавамі такім чынам, каб яны былі карыснымі Расіі, адзначаючы,





што інтэграцыя павінна замыкацца не ў тэрытарыяльным і палітычным аб’яднаньні, а ў стварэньні палітычных, вайскова-палітычных і іншых умоваў для эканамічнага ўзаемадзеяньня і ўзаемапранікненьня, якое, у сваю чаргу, павінна забясьпечваць і падтрымліваць палітычныя і вайскова-палітычныя інтарэсы Расіі на тэрыторыі былога СССР. Зыходзячы з гэтага, аўтары тэзысаў лічылі, што Расія павінна настойваць на скасаваньні ўсіх абмежаваньняў на рух тавараў, на стварэньні ўмоваў для ўдзелу капіталаў усіх краінаў у прыватызацыі, дабівацца перадачы прамысловых і іншых актываў у абмен на даўгі; стварыць эфэктыўную сыстэму ўзаемаразьлікаў, спачатку на двухбаковай аснове, а потым і праз стварэньне плацежнага саюзу з рэзэрвовай валютай; дабівацца стварэньня цеснага вайскова-палітычнага саюзу значнай часткі дзяржаваў былога СССР у пэрспэктыве, магчыма, з аб’яднанымі ўзброенымі сіламі; праводзіць курс на права ўсіх грамадзянаў былога СССР мець падвойнае грамадзянства, на абарону ад якой-небудзь дыскрымінацыі[12].

Чальцы РВАП выказваліся на карысьць двухбаковых формаў узаемадзеяньня з дзяржавамі былога СССР, зьвяртаючы ўвагу на тое, што Расія займае ў двухбаковых адносінах “больш моцныя пазыцыі, чымся ў сыстэме шматбаковых кантактаў”. Яны ўважалі, што Расія павінна мець асобна распрацаваны курс у адносінах да кожнай зь дзяржаваў былога СССР[13].

Прапановы РВАП знайшлі пэўнае адлюстраваньне ў Стратэгічным курсе РФ зь дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў, які Прэзыдэнт Расійскай Фэдэрацыі Б. Ельцын зацьвердзіў сваім указам 14 верасьня 1995 г. У гэтым дакумэнце гаварылася, што разьвіцьцё СНД адпавядае жыцьцёвым інтарэсам РФ, а адносіны зь дзяржавамі Садружнасьці ёсьць важным фактарам улучэньня Расіі ў сусьветныя палітычныя і эканамічныя структуры. Прыярытэтнасьць адносінаў зь дзяржавамі — удзельніцамі СНД тлумачылася сканцэнтраваньнем на тэрыторыі Садружнасьці галоўных жыцьцёвых інтарэсаў Расіі ў сфэры эканомікі, абароны, бясьпекі, абароны правоў расіянаў, а таксама тым, што эфэктыўнае супрацоўніцтва зь дзяржавамі СНД будзе супрацьстаяць цэнтрабежным тэндэнцыям у самой Расіі.

Галоўнай мэтай Расіі ў адносінах з краінамі СНД абвяшчалася стварэньне інтэграванага эканамічна і палітычна аб’яднаньня дзяржаваў, здольнага прэтэндаваць на пачэснае месца ў міжнароднай супольнасьці. Асноўнымі заданьнямі былі: забесьпячэньне стабільнасьці ўва ўсіх яе вымярэньнях (палітычным, вайсковым, эканамічным, гуманітарным і прававым); судзеяньне станаўленьню ўдзельніцаў СНД у якасьці палітычна і эканамічна ўстойлівых дзяржаваў, якія б праводзілі дружалюбную палітыку ў адносінах да Расіі; умацаваньне Расіі ў якасьці вядучай сілы ў фармаваньні новай сыстэмы міждзяржаўных палітычных і эканамічных адносінаў на постсавецкай прасторы; нарошчваньне інтэграцыйных працэсаў у СНД[14] . Пункт 14 дакумэнту зьмяшчаў даручэньні расійскай дыпляматыі ўва ўзаемадзеяньні з трэцімі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі

“дасягаць зь іх боку разуменьня таго, што гэты рэгіён (СНД — *Аўт.*) перш за ўсё ёсьць зонай інтарэсаў Расіі”[15].

Пункт 19 Стратэгічнага курсу быў прысьвечаны пытаньню двухбаковых адносінаў Расіі зь дзяржавамі СНД. У гэтым пункце гаварылася: “Двухбаковыя адносіны зь дзяржавамі СНД фармуюцца з улікам спэцыфікі кожнай з гэтых дзяржаваў і іх гатоўнасьці да розных формаў паглыбленай інтэграцыі. Пры правядзеньні расійскай палітыкі ў адносінах да дзяржаваў СНД у двухбаковым пляне зыходзіць з таго, што інтарэсам Расіі адпавядаюць:

судзеяньне стабілізацыі палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага становішча ў гэтых краінах;

глыбокае паэтапнае ўцягваньне іх на добраахвотнай аснове ў інтэграцыйныя працэсы, у калектыўнае разьвязаньне пытаньняў вайсковай бясьпекі, аховы межаў, міратворчай дзейнасьці;

недапушчэньне канфрантацыйнага характару адносінаў Расіі зь дзяржавамі СНД”[16].

Па сутнасьці, у дактрынальных дакумэнтах расійскай палітыкі што да СНД першай паловы 1990-х гг. прастора былога СССР разглядалася як зона асаблівых інтарэсаў Расіі, а перад дыпляматыяй ставілася заданьне спрыяць кансалідацыі постсавецкай прасторы з мэтай стварэньня новага міждзяржаўнага аб’яднаньня, у якім Расія адыгрывала б вядучую ролю. Умацаваньне пазыцыяў іншых дзяржаваў на гэтай прасторы разглядалася як аслабленьне ўплыву Расіі й пагроза яе нацыянальным інтарэсам. Канчатковае завяршэньне адпаведная ўстаноўка атрымала з прыходам у МЗС РФ у 1996 г. Яўгена Прымакова, які выступаў у якасьці аднаго з аўтараў і актыўных прапагандыстаў канцэпцыі “шматпалярнага сьвету”.

Апошнім усплёскам інтэграцыйнай актыўнасьці што да постсавецкай прасторы як адзінага цэлага стала ануляваньне расійскай Дзяржаўнай думай 15 сакавіка 1996 г. пастановы Вярхоўнага Савету РСФСР ад 12 сьнежня 1991 г. “Аб дэнансацыі дамовы аб стварэньні СССР”. Ануляваўшы адпаведную пастанову, дэпутаты расійскай дзяржаўнай думы пацьвердзілі вынікі рэфэрэндуму па захаваньні Саюзу ССР ад 17 сакавіка 1991 г., рэкамэндавалі Прэзыдэнту РФ “распрацаваць сыстэму захадаў для далейшага паглыбленьня інтэграцыі РФ, Рэспублікі Беларусі й іншых былых рэспублік Савецкага Саюзу, улучна з правядзеньнем рэфэрэндуму РФ у пытаньні паэтапнага ўмацаваньня адзінства народаў, якія складаюць Саюз ССР”, а ўраду РФ “у рамках дасягнутых дамоўленасьцяў зь дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў узмацніць кантроль за правядзеньнем інтэграцыйных захадаў у сфэры эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, сацыяльна-культурнага і абароннага супрацоўніцтва дзяржаваў, створаных на тэрыторыі Саюзу ССР”[17].

20 сакавіка 1996 г. Б.М. Ельцын падпісаў указ, які скасоўваў пастанову Дзяржаўнай думы і пацьвярджаў дзеяньне пастановаў Вярхоўнага Савету РСФСР, прынятых ў сьнежні 1991 г. Аднак дэманстрацыйная пастанова Дзяржаўнай





думы выклікала грамадзкую дыскусію пра лёс і пэрспэктывы разьвіцьця СНД.

У маі 1996 г. у “Независимой газете” зьявіліся новыя тэзісы РВАП пад назвай “Возродится ли СССР?” Аўтары тэзысаў прыходзілі да высновы, што адраджэньне СССР у ягонай ранейшай форме немагчымае, а палітыка яго адраджэньня любой цаной ёсьць “надзвычай рэакцыйнай утопіяй”, якая можа падарваць сілы Расіі. Разам з тым яны дапускалі магчымасьць стварэньня новага міждзяржаўнага аб’яднаньня фэдэрацыйнага тыпу, увязваючы посьпех яго разьвіцьця з посьпехамі гаспадарчых рэформаў і палітычнай стабілізацыяй у Расіі. На думку чальцоў РВАП, працэс стварэньня новай фэдэрацыі мог заняць каля 10—15 гадоў. Галоўнай задачай вонкавай палітыкі Расіі яны бачылі курс на стварэньне трывалага інтэграцыйнага ядра ў выглядзе саюзу Расіі, Беларусі, Казахстана і Кіргізіі, а з засталымі былымі савецкімі рэспублікамі, якія не пажадаюць увайсьці ў новую фэдэрацыю, — будаваць адносіны на двухбаковай аснове і ў рамках СНД як “круглага стала” былой культурна-гістарычнай супольнасьці (накшталт Брытанскай Супольнасьці)[18].

У канцы 1990-х гг. стала зразумела, што практычна аніводная з пастаўленых у першай палове дзесяцігодзьдзя мэтаў Расіі што да СНД не дасягнута. Новыя незалежныя дзяржавы збольшага пераарыентавалі свой вонкавы гандаль на краіны, якія знаходзіліся за межамі былога СССР, устанавілі цесныя кантакты зь міжнароднымі фінансавымі інстытутамі. Дакумэнты аб стварэньні зоны свабоднага гандлю ў межах СНД па сутнасьці засталіся на паперы. Беспасьпяховымі былі ня толькі спробы стварыць эфэктыўную сыстэму калектыўнай бясьпекі ў межах СНД, але і дзеяньні па каардынацыі выступленьняў дзяржаваў СНД на міжнароднай арэне. Найбольш відавочна гэта праявілася ўвесну 1999 г., калі практычна ўсе дзяржавы СНД праігнаравалі заклік Расіі ўстрымацца ад кантактаў з НАТО ў знак пратэсту супраць вайсковай апэрацыі Альянсу на Балканах, а іхныя кіраўнікі выехалі ў Вашыгтон, дзе ўзялі ўдзел у сьвяткаваньні 50-годзьдзя стварэньня НАТО. Нарэшце, ня выйшла эфэктыўнага шматбаковага супрацоўніцтва дзяржаваў СНД у галіне культуры, адукацыі, у гуманітарнай сфэры.

Паступова Расія ўсё больш і больш пераносіла акцэнт у сваёй палітыцы што да СНД на разьвязаньне канкрэтных пытаньняў супрацоўніцтва ў рамках кантактаў з асобнымі дзяржавамі Садружнасьці. У сярэдзіне 1990-х гг. расійская дыпляматыя спыніла ўжываньне тэрміну “дзяржавы блізкага замежжа” што да дзяржаваў СНД. У кастрычніку 1997 г. на саміце дзяржаваў — удзельніцаў СНД у Кішынэве Б.Ельцын заявіў: “Непрадузяты погляд на нацыянальныя інтарэсы Расіі паказвае: мы толькі выйграем, калі нас будуць акружаць стабільныя, эканамічна разьвітыя і палітычна незалежныя дружалюбныя дзяржавы. Мы зацікаўленыя ў тым, каб нашы суседзі былі саюзьнікамі, і прытым моцнымі”[19].

У другой палове 1990-х гг. Расія стала дапускаць магчымасьць адначасовага разьвіцьця Садружнасьці “на розных хуткасьцях”, з фармаваньнем у рамках СНД “інтэграцыйнага ядра” ў выглядзе дзяржаваў, гатовых пайсьці на вышэйшы ўзро-

вень супрацоўніцтва, з магчымым наступным далучэньнем да яго астатніх удзельнікаў Садружнасьці. З 1999 г. Расія канчаткова зьняла патрабаваньне надзяліць органы Садружнасьці наднацыянальнымі паўнамоцтвамі.

У гэты ж час падтрымка інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы перастала разглядацца ў якасьці галоўнага прыярытэту расійскай вонкавай палітыкі. Калі Канцэпцыя нацыянальнай бясьпекі РФ, зацьверджаная 17 сьнежня 1997 г., арыентавала расійскую дыпляматыю на "забесьпячэньне найважнейшых нацыянальных інтарэсаў, разьвіцьцё адносінаў Расіі зь вядучымі дзяржавамі сьвету, усебаковае супрацоўніцтва й інтэграцыю ў рамках Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў, наладжваньне эфэктыўнага супрацоўніцтва ў рамках Саюзу Беларусі й Расіі, а таксама з удзельнікамі Дамовы паміж РФ, РБ, Рэспублікай Казахстан і Кіргіскай Рэспублікай аб паглыбленьні інтэграцыі ў эканамічным і гуманітарным абсягах", то ў новай рэдакцыі Канцэпцыі нацыянальнай бясьпекі, якую новы кіраўнік Расіі У. Пуцін зацьвердзіў 10 студзеня 2000 г., гаварылася, што "нацыянальныя інтарэсы Расіі ў міжнароднай сфэры палягаюць у забесьпячэньні сувэрэнітэту, узмацненьні пазыцыяў Расіі як вялікай дзяржавы — аднаго з уплывовых цэнтраў шматпалярнага сьвету, у разьвіцьці раўнапраўных і ўзаемавыгадных адносінаў з усімі краінамі й інтэграцыйнымі аб’яднаньнямі, найперш зь дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў і традыцыйнымі партнэрамі Расіі, у непарушным захаваньні правоў і свабодаў чалавека і недапушчальнасьці тарнаваньня пры гэтым падвойных стандартаў"[20].

28 чэрвеня 2000 г. Прэзыдэнт РФ У.Пуцін зацьвердзіў новую Канцэпцыю вонкавай палітыкі РФ. Дакумэнт разглядае ўзаемадзеяньне зь дзяржавамі СНД у якасьці аднаго з рэгіянальных прыярытэтаў вонкавай палітыкі Расіі. У новай канцэпцыі гаварылася, што пры вызначэньні сваёй палітыкі што да СНД Расія зыходзіць з канцэпцыі разнахуткаснай і рознаўзроўневай інтэграцыі й будзе рабіць націск на разьвіцьцё добрасуседзкіх адносінаў і стратэгічнага партнэрства з усімі дзяржавамі — удзельніцамі СНД. Практычныя адносіны з кожнай зь дзяржаваў СНД прапаноўвалася будаваць "з улікам сустрэчнай адкрытасьці для супрацоўніцтва, гатоўнасьці належным чынам улічваць інтарэсы Расійскай Фэдэрацыі, у тым ліку ў забесьпячэньні правоў расійскіх суродзічаў"[21]. Да прыярытэтных кірункаў супрацоўніцтва былі аднесеныя сумесныя намаганьні па ўрэгуляваньні канфліктаў у дзяржавах — удзельніцах СНД, разьвіцьцё супрацоўніцтва ў вайскова-палітычным абсягу і сфэры бясьпекі, асабліва ў барацьбе зь міжнародным тэрарызмам і экстрэмізмам; разьвіцьцё эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку стварэньне зоны свабоднага гандлю, рэалізацыя праграмаў сумеснага рацыянальнага выкарыстаньня прыродных рэсурсаў; забесьпячэньне выкананьня ўзаемных абавязаньняў па захаваньні й павелічэньні ў дзяржавах — удзельніцах СНД супольнай культурнай спадчыны[22].

Эвалюцыя падыходаў расійскага кіраўніцтва што да СНД адбывалася і пасьля. У прыватнасьці, у студзені 2001 г. У. Пуцін у выступе перад кіраўнічымі кадрамі дыпляматычнай службы МЗС РФ заўважыў: "Наш безумоўны прыярытэт





— краіны СНД. Расія застаецца натуральным... ядром інтэграцыйных працэсаў Садружнасьці. А інтэграцыя як такая, проста як працэс — гэта не самамэта. Яна нам як такая і не патрэбная. Не патрэбная нам як лёзунг або як шырма. Яна павінна несьці рэальную карысьць нашай краіне і нашым грамадзянам"[23]. Дзеля гэтага дыпляматыя РФ стала разглядаць дзяржавы СНД ня столькі як зону асаблівых інтарэсаў Расіі, колькі як замежныя суседнія краіны, якія маюць права на ажыцьцяўленьне самастойнай вонкавай палітыкі, але зьвязаныя з Расіяй спэцыфічнымі інтарэсамі.

Невыпадкова ўвосень 2001 г. расійскія кіраўнікі далі згоду на разгортваньне вайсковых базаў ЗША і іншых дзяржаваў Захаду ў дзяржавах Цэнтральнай Азіі, у пачатку 2002 г. згадзіліся з прысутнасьцю амэрыканскіх вайсковых спэцыялістаў у Грузіі.

Што да падыходаў Расіі да Беларусі, то першапачаткова Беларусь у расійскіх тэарэтычных распрацоўках асобна не вылучалася, адносіны зь ёй разглядаліся ў кантэксьце адносінаў зь іншымі дзяржавамі СНД. Напрыклад, у Канцэпцыі вонкавай палітыкі РФ 1993 г. Беларусь разам з Украінай і Казахстанам узгадвалася як дзяржава, зь якой Расія павінна найхутчэй укласьці міждзяржаўную палітычную дамову. Таксама ў Канцэпцыі гаварылася пра зацікаўленасьць Расіі ў тым, каб Беларусь разам з Украінай і Казахстанам пазбавілася ад ядравай зброі[24].

Разам з тым, расійскія дыпляматы і спэцыялісты-міжнароднікі ўспрымалі Беларусь як краіну, схільную да цясьнейшай лучнасьці з Расіяй. Так, высокапастаўлены супрацоўнік МЗС РФ Фёдар Шэлаў-Каведзяеў у інтэрвію "Независимой газете" ў ліпені 1992 г. заявіў: "У СНД дакладна вызначыліся дзьве групы дзяржаваў: сем схільныя да разьвіцьця цеснага ўзаемадзеяньня на шматбаковай аснове — гэта, апрача Расіі, Беларусь, Казахстан, Арменія, Кыргыстан, Таджыкістан і ў апошні час усё больш Узбэкістан; чатыры — Украіна, Малдова, Азэрбайджан і Туркмэністан — пакуль займаюць больш ўхілістую пазыцыю"[25]. Пры гэтым расійскі дыплямат уважаў, што дзяржавы, якія больш схільныя да разьвіцьця супрацоўніцтва ў межах СНД, у тым ліку Беларусь, павінны карыстацца асаблівымі перавагамі ў сфэры двухбаковых адносінаў з Расіяй[26]. Да цясьнейшага саюзу зь Беларусяй (разам з Казахстанам і Грузіяй) заклікалі і аўтары тэзысаў "Стратэгія для Расіі", якія падкрэсьлівалі, што няўдача ў справе збліжэньня Расіі з гэтымі краінамі паставіць крыж на СНД[27].

У жніўні 1993 г. намесьнік дырэктара Інстытуту ЗША і Канады РАН Віктар Крамянюк у артыкуле "Вонкавая палітыка Расіі: патрэбныя арыенціры", які апублікавала "Независимая газета", пісаў: "Расія... (калі яна зможа дамовіцца аб эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з Украінай і Беларусяй) магла б прапанаваць цэлы шэраг спакушальных праектаў для гістарычна і этнічна роднасных народаў: эканамічную інтэграцыю, якая будавалася б ня толькі на традыцыйным падзеле працы (расійскія рэсурсы ўзамен на ўсходнеэўрапейскія тавары), але і... у станаўленьні рынкавай гаспадаркі; палітычнае ўзаемадзеяньне, заснаванае на стварэньні эфэктыўных мэханізмаў кантраляваньня і ўрэгуляваньня канфліктаў,

а таксама на стратэгічным узаемадзеяньні з НАТО; супольную культурна-этнічную прастору, заснаваную на супольнасьці славянскіх культур. Дасягненьне такога ўзаемадзеяньня стварыла б неабходную структуру супрацоўніцтва ў гэтай частцы Эўропы, якая магла б паставіць сваёй мэтай набыцьцё здольнасьці ўсходнеэўрапейцаў вырашаць свае праблемы самастойна і толькі на гэтай аснове — стаўляць заданьне супрацоўніцтва і зьбліжэньня з ЭЗ у рамках НБСЭ”[28].

Вышэйзгаданы Адранік Міґранян у студзені 1994 г. апублікаваў у “Независимой газете” вялікі артыкул, у якім разглядаліся праблемы ўзаемаадносінаў Расіі з асобнымі дзяржавамі СНД. У разьдзеле, прысьвечаным Беларусі, адзначалася: “Адносіны Расіі й Беларусі вызначаюцца шэрагам асаблівасьцяў. У адрозьненьне ад Украіны, рэспублік Прыбалтыкі і Закаўказьзя ў Беларусі не былі настолькі моцныя настроі на карысьць выхаду са складу СССР і ўтварэньня незалежнай дзяржавы. Найбольш радыкальныя прыхільнікі гэтай лініі з Народнага фронту карысталіся нязначным уплывам у народзе. Іншае адрозьненьне Беларусі ад Украіны крыецца ў тым, што ў гэтай рэспубліцы ніколі не існавалі трывалыя антырасійскія настроі і не было глыбокай псыхалягічнай траўмы ў народу ад нерэалізаванай беларускай дзяржаўнасьці... /.../ Хаця сёньня ў Беларусі адчуваюць смак да ўлады ў якасьці лідэраў вялікай самастойнай дзяржавы рэспубліканскія элітныя групы, але мноства повязяў этнакультурнага, моўнага, эканамічнага характару і адсутнасьць якіх-небудзь устойлівых антаганізмаў паміж беларускім і расійскім народамі ствараюць спрыяльныя ўмовы для будучага цясьнейшага зьбліжэньня паміж Расіяй і Беларусяй, асабліва калі ўлічыць, што сыравіну і энэрганосьбіты Беларусь атрымлівае галоўным чынам з Расіі й рынкам збыту гатовых тавараў для гэтай рэспублікі ёсьць таксама Расія”[29]. На падставе гэтага А. Міґранян рабіў выснову, што “цэнтральнай тэндэнцыяй у адносінах Расіі з Беларусяй ёсьць рух у бок цясьнейшай вайскова-палітычнай, эканамічнай інтэграцыі, якая пры спрыяльным разьвіцьці палітычнай сытуацыі ў Расіі можа стварыць устойлівы саюз Расіі зь Беларусяй як трывалага ядра ў рамках СНД”. Таксама расійскі палітоляг цьвердзіў, што інтэграцыйныя тэндэнцыі ў расійска-беларускіх адносінах “значна памяншаюць пагрозу прасоўваньня на Беларусь трэціх краінаў на шкоду Расіі й робяць малаверагодным магчымасьць фармаваньня Балта-Чарнаморскай садружнасьці, дзе адным з ключавых зьвёнаў павінна была б стаць Беларусь з мэтаю ізаляцыі Расіі й стварэньня “санітарнага кардону” паміж Расіяй і засталай часткай Эўропы”[30].

Першапачаткова расійцы ўважалі, што практыка ўзаемадзеяньня Расіі й Беларусі мае арыгінальны характар і ня можа быць пашыраная на іншыя дзяржавы — удзельніцы СНД. Адпаведная думка праводзілася, напрыклад, у тэзысах “Стратэгія для Расіі-2” у чэрвені 1994 г., дзе адзначалася, што прыклад Беларусі, зь якой Расія пайшла на поўнае аб’яднаньне фінансавых сыстэмаў, ёсьць выняткам, а ня правілам з прычыны блізкасьці гэтай краіны да Расіі, яе стратэгічнага знаходжаньня[31].





У 1996 г. Беларусь стала разглядацца ў якасьці аднаго з галоўных саюзьнікаў Расіі ў сьвеце і складовай часткі інтэграцыйнага ядра на постсавецкай прасторы. У тэзысах РВАП “Возродится ли Советский Союз?” гаварылася, што адносіны зь Беларусяй маюць асаблівую значнасьць для Расіі, бо Беларусь падзяляе дзяржавы Балтыі і Ўкраіну і выконвае ролю “моста” паміж Расіяй і Захадам. “Страта пэрспэктывы палітычнага і асабліва вайскова-палітычнага зьбліжэньня зь Беларусяй пагражае паважнай імавернасьцю аслабленьня пазыцыяў Расіі ў СНД. За гэтую пэрспэктыву можна заплаціць і пэўную эканамічную цану”, — падкрэсьлівалі аўтары тэзысаў[32]. Яны адзначалі, што пасьпяховая інтэграцыя Расіі зь Беларусяй і Казахстанам, якая павысіць жыцьцёвы ўзровень жыхароў гэтых краін, можа аказаць уплыў на Ўкраіну і падштурхнуць яе кіраўнікоў да больш актыўнага ўдзелу ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы. Зыходзячы з гэтага, у тэзысах зьмяшчалася прапанова нарошчваць намаганьні зь Беларусяй “па афармленьні ўжо ў найбліжэйшыя год-два адносінаў як мінімум канфэдэрацыйнага тыпу, нягледзячы на праблемы, якія маюцца ў эканамічнай і прававой сфэрах”, наладзіць мэханізм сталага дыпляматычнага, вайскова-палітычнага і вайскова-прамысловага ўзаемадзеяньня”[33].

Пасьля стварэньня Супольнасьці Расіі й Беларусі ў красавіку 1996 г. паўстала пытаньне аб далейшым умацаванні сувязяў паміж дзьвюма краінамі. За зьбліжэньне выступалі шмат якія чальцы расійскага ўраду. У прыватнасьці, расійскі міністар у справах СНД Аман Тулееў у сьнежні 1996 г. казаў: “Эканамісты-практыкі востра крытыкавалі нашу дамову аб эканамічным саюзе зь Беларусяй, якая ў гэты пэрыяд спалучаецца зь некаторымі эканамічнымі стратамі для Расіі. Але з пункту погляду даўгатэрміновых стратэгічных мэтаў Супольнасьць мае шэраг відавочных перавагаў: выхад да заходніх межаў былога СССР, доступ да рынкаў збыту і стабільнасьць на заходніх рынках Расіі, а таксама іншыя несумненныя плюсы. Так, мы маем праблемы, перш за ўсё ў заканадаўчых адрозьненьнях. Апрача таго, складанасьці ўзьнікаюць праз розныя тэмпы ў абсягу рэформаў. Але ўсе гэтыя цяжкасьці можна пераадолець шляхам міждзяржаўных пагадненьняў, а галоўнае — пры наяўнасьці добрай волі з абодвух бакоў”[34]. А. Тулееў зьвяртаў увагу на тое, што Беларусь і Расія могуць разьвіваць каапэрацыйныя сувязі ў вытворчасьці радыёэлектроннай прадукцыі, вылічальнай тэхнікі, комплексаў сыстэмаў супрацьракетнай абароны, сыстэмаў кіраваньня прамысловымі робатамі, фотасчытвальных мэханізмаў, радыёоптыкі, сыстэмаў спэцрадыёабсталяваньня. Таксама ён лічыў, што інтэграцыя зь Беларусяй прынясе Расіі карысьць у сувязі з магчымасьцю транспартаваньня расійскага газу на заходні рынак праз тэрыторыю Беларусі, а таксама ў сувязі з наладжваньнем супрацоўніцтва паміж расійскім і беларускім ВПК. Нарэшце, расійскі міністар заклікаў праявіць больш увагі да праблемы расійска-беларускай інтэграцыі, зыходзячы з таго, што адпаведны працэс можа даць дадатковы імпульс аб’яднаўчым працэсам на ўсёй прасторы Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў[35].

У 1997 г. кіраўнікі Расіі й Беларусі выказалі гатоўнасьць стварыць цясьнейшы міждзяржаўны саюз. У сувязі з гэтым у расійскім грамадзтве пачаліся дыскусіі што да неабходнасьці і формаў расійска-беларускага аб’яднаньня.

За далейшае збліжэньне зь Беларусяй выступаў міністар замежных справаў Расіі Я. Прымакоў. У інтэрвію газэце “Известия” ў траўні 1997 г. ён падкрэсьліў, што ставіцца да адпаведнай ідэі “беззасьцярожна дадатна”. “Гэта зусім не азначае, што мы павінны прымаць усё, што дзеецца ў Беларусі. І гэта не азначае, што мы павінны навязваць што-небудзь. Трэба шукаць аб’ектыўныя асновы для збліжэньня, і яны існуюць, існуюць у вялікай колькасьці”, — заяўляў кіраўнік расійскага вонкавапалітычнага ведамства. Я. Прымакоў лічыў, што аб’яднаньне зь Беларусяй дае Расіі вялізныя геапалітычныя плюсы, але заклікаў не разглядаць інтэграцыю як адказ на пашырэньне НАТО на ўсход[36]. Падыходы кіраўніка расійскага МЗС падзялялі і іншыя супрацоўнікі расійскага вонкавапалітычнага ведамства.

Адпаведныя настроі выказваліся і ў сумесным спавешчаньні расійскага Фонду “Палітыка”, Расійскага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў і РВАП, які быў апублікаваны ў красавіку 1997 г. у “Независимой газете” пад красамоўнай назвай “Российско-белорусский союз: выгоды фундаментальны, негативные последствия минимальны”. Складальнікі спавешчаньня ўважалі, што збліжэньне зь Беларусяй ёсьць даволі натуральным працэсам. “Шмат якія эканамічныя сувязі дзьвюх краінаў не парушаныя, існуе ўзаемная зацікаўленасьць у іх разьвіцьці. Курс на збліжэньне падтрымліваецца грамадзкасьцю дзьвюх краінаў, адпавядае агульным імкненьням іх найвышэйшага кіраўніцтва, большыні палітычных партыяў і рухаў. Захоўваецца мэнталітэт братэрства і гістарычнага адзінства народаў. Краіны Захаду ня пойдуць на адкрытую канфрантацыю з Расіяй з-за яе збліжэньня зь Беларусяй. Яно ўспрымаецца як працэс, які хаця і не адпавядае інтарэсам Захаду, але дастаткова прадказальны і натуральны, з улікам этналінгвістычнай і гістарычнай блізкасьці расійскага і беларускага народаў, які выклікае аналёгію зь нядаўнім аб’яднаньнем Нямеччыны”, — пісалі яны.

Расійскія аналітыкі лічылі, што аб’яднаньне зь Беларусяй адпавядае нацыянальным інтарэсам Расіі, дае ёй шэраг геапалітычных і ў пэрспэктыве — эканамічных перавагаў. Да такіх перавагаў яны адносілі:

— беспасярэдні выхад на межы Цэнтральнаэўрапейскага рэгіёну;
— ухіленьне патэнцыйнай пагрозы стварэньня так званага “Балтыйска-Чарнаморскага поясу” ізаляцыі Расіі;
— атрыманьне дадатковых моцных сродкаў узьдзеяньня на адносіны з Украінай, нэўтралізацыю магчымасьці пераўтварэньня Ўкраіны ў “буфэрную” антырасійскую дзяржаву;
— узмацненьне пазыцыяў для дыялёгу з Польшчай і дзяржавамі Балтыі;
— наданьне імпульсу дэманстрацыяй прыкладу разьвіцьця працэсаў далейшага збліжэньня ў “інтэграцыйным ядры” СНД (Расія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія) і, магчыма, у Садружнасьці ў цэлым;
— агульнае ўзмацненьне ўплыву Расіі ў міжнароднай палітыцы праз доказ сваёй здольнасьці да правядзеньня такой буйнамаштабнай акцыі, як аб’яднаньне з суседняй незалежнай дзяржавай;
— павелічэньне вайсковых магчымасьцяў Саюзу дзьвюх дзяржаваў у галіне звычайных узбраеньняў коштам здабыцьця кантролю над дастаткова баяздольнай беларускай арміяй; атрыманьне дадатковых магчымасьцяў для ўдасканаленьня як уласнай сыстэмы СПА і СРА, так і аб’яднанай СПА;
— ускладненьне дзейнасьці антырасійскіх сілаў у Беларусі;
— сур’ёзнае аслабленьне сындрому “падзеленае нацыі” ў Расіі;
— стварэньне супольнага рынку тавараў, працы і капіталу і скасаваньне бар’ераў на шляху іх руху;
— магчымасьць выкарыстаньня выгаднага геаэканамічнага разьмяшчэньня Рэспублікі Беларусі і ейнай разьвітой транспартнай і вонкавагандлёвай інфраструктуры ў супольных эканамічных інтарэсах;
— зьніжэньне кошту перавозак у Калінінградзкі анкляў Расіі;
— удзел у прыватызацыі ў Беларусі;
— атрыманьне Расіяй надзейнага транспартнага калідору для паставак газу і нафты ў Эўропу, абмінаючы тэрыторыю Ўкраіны і дзяржаваў Балтыі[37].

Складальнікі спавешчаньня зьвярталі ўвагу і на магчымыя нэгатыўныя наступствы інтэграцыі, да якіх яны адносілі польска-ўкраінскае і польска-летувіскае збліжэньне, а таксама далейшую кансалідацыю балтыйскіх краінаў; павышаную ўвагу Захаду да Ўкраіны; нарастаньне пэўных супярэчнасьцяў у адносінах паміж Расіяй і Захадам (галоўным чынам з ЗША); дэстабілізацыю ўнутрыпалітычнай сытуацыі ў Беларусі; пагаршэньне эканамічнага становішча Расіі[38]. Разам з тым яны ўважалі, што аб’яднаньне адпавядае нацыянальным інтарэсам Расіі[39].

Закранаючы пытаньне аб форме аб’яднаньня Расіі і Беларусі, складальнікі спавешчаньня заяўлялі, што найбольш рэалістычным выглядае пераўтварэньне “Супольнасьці” ў канфэдэрацыйны Саюз дзьвюх суверэнных дзяржаваў з пэрспэктывай пераўтварэньня канфэдэрацыі ў фэдэрацыю. Таксама яны прапаноўвалі прыняць у найкарацейшыя тэрміны заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя акты для ўніфікацыі асноўных прынцыпаў рэгуляваньня эканомікі, бюджэтнай, цэнавай, грашова-крэдытнай, вонкаваэканамічнай і гандлёвай палітыкі; стварыць адзіную наднацыянальную сыстэму кіраваньня тымі сфэрамі, пастанова пра аб’яднаньне якіх прынятая; паэтапна стварыць грашовы саюз з пэрспэктывай поўнага аб’яднаньня грашова-крэдытных сыстэмаў на аснове расійскага рубля; стварыць адзіны бюджэт саюзу для фінансаваньня наднацыянальных органаў і су-

польных эканамічных праграмаў; правесьці поўнамаштабную рэалізацыю пагадненьня аб Мытным саюзе; зблізіць сыстэмы рэгуляваньня сацыяльна-эканамічных працэсаў і вызначыць агульныя прынцыпы наданьня сацыяльных дзяржаўных гарантыяў; стварыць адзіную інфармацыйную прастору з уніфікацыяй ўліку і статыстыкі[40].

Аўтары спавешчаньня заклікалі расійскае кіраўніцтва не навязваць Беларусі фарсаванага аб'яднаньня ў форме фэдэрацыі, не выносіць пытаньня аб пераўтварэньні "Супольнасьці" ў Саюз на рэфэрэндум, ня браць у якасьці эталёну вылучна расійскае заканадаўства ў сфэры рэгуляваньня эканамічных працэсаў, не настойваць на выкарыстаньні ў Беларусі расійскай схемы прыватызацыі. Нэгатыўна ставіліся яны да тэзысу, што на момант палітычнага аб'яднаньня абедзьве дзяржавы абавязаны зблізіць ці нават уніфікаваць свае эканамічныя сыстэмы. Таксама складальнікі спавешчаньня лічылі мэтазгодным стварэньне Грамадзкай асамблеі Саюзу, сталай Камісіі па інтэграцыі зь Беларусяй пад кіраўніцтвам Б.Ельцына або якогась аўтарытэтнага расійскага дзеяча, правядзеньне рэгулярных (не радзей за 1 раз у 2 месяцы) сустрэчаў кіраўнікоў дзьвюх дзяржаваў для абмеркаваньня найбольш вострых на кожны канкрэтны момант праблемаў разьвіцьця Саюзу[41].

У заключнай частцы спавешчаньня адзначалася: "Найгоршым сцэнаром разьвіцьця падзеяў на сёньняшні момант быў бы зрыў ратыфікацыі й рэалізацыі падпісанай прэзыдэнтамі дзьвюх краінаў Дамовы аб Саюзе. Гэта мела б наступствам: найпаважнейшы падрыў прэстыжу Расіі й яе найвышэйшага кіраўніцтва, ня здольнага скаардынавана правесьці найважнейшую палітычную акцыю; прыпыненьне і рух назад у двухбаковых адносінах, імпульс да дэзінтэграцыі ў СНД; паскораную "украінізацыю" вонкавай і ўнутранай палітыкі Беларусі з больш вялікай арыентацыяй на краіны НАТО і апорай на нацыянальна арыентаваныя сілы ўнутры краіны; рэзкае ўскладненьне сытуацыі з выхадам на эўрапейскія рынкі і вакол Калінінградскай вобласьці; цяжкасьці з падтрыманьнем абароннай інфраструктуры на заходнім кірунку; страту адзінага стратэгічнага саюзьніка.

Калі крок да аб'яднаньня зроблены, то неабходна цьвёрда і пасьлядоўна ісьці і далей па гэтым шляху"[42].

Аднак Б. Ельцын прыслухоўваўся да гэтых парадаў толькі часткова. Зь яго мэмуараў, дзе быў апісаны працэс падрыхтоўкі дамовы аб стварэньні Саюзу Беларусі й Расіі ў 1997 г., вынікае, што прэзыдэнт РФ падтрымліваў працэс збліжэньня зь Беларусяй, разглядаючы яго як аб'яднаньне роднасных славянскіх народаў і сродак паскорыць інтэграцыю на прасторы СНД. Разам з тым расійскі кіраўнік выступаў супраць стварэньня наднацыянальных саюзных органаў з правам прымаць пастановы, абавязковыя для органаў улады РФ, назваўшы адпаведны варыянт дамовы "непрадуманым і небясьпечным"[43]. Таксама Б.Ельцын уважаў, што рэальная інтэграцыя паміж дзьвюма дзяржавамі не адбудзецца, пакуль у Беларусі ня будуць праведзеныя радыкальныя эканамічныя рэформы[44].





Тэма беларуска-расійскай інтэграцыі зноў набыла актуальнасьць у 1999 г. Як і раней, расійскія спэцыялісты ўважалі, што інтэграцыя зь Беларусяй прынясе карысьць Расіі. Напрыклад, кіраўнік Цэнтру дасьледаваньняў эканамічных праблемаў СНД Вячаслаў Вашанаў у сакавіку 1999 г. пісаў, што Масква і Менск маюць супольныя інтарэсы найперш у абсягу паставак прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэньня, якую Расія можа атрымліваць зь Беларусі па цэнах, ніжэйшых, за сусьветныя, прычым без разьлікаў у валюце. Таксама ён зьвяртаў увагу на тое, што Беларусь магла б пастаўляць у Расію да 55% намэнклятуры камплектуючых для мэталарэзных станкоў і столькі ж трактарных модуляў, якія зусім не выраблялiся ў Расіі, лічыў пэрспэктыўным выкарыстаньне беларускіх НПЗ для перапрацоўкі расійскай нафты, рэалізацыю саюзных праграмаў для вырабу грузавых аўтамабіляў і тэлевізараў, супрацоўніцтва ў сфэры ВПК. Разам з тым В. Вашанаў прызнаваў, што расійскія прадпрыемствы пачалі асвойваць выпуск тых відаў прадукцыі, на якіх спэцыялізавалася Беларусь, і заклікаў "не разьвіваць двухбаковыя адносіны, няхай з самым прывілеяваным партнэрам, на шкоду засталым краінам СНД"[45].

Аднак вырашальным чыньнікам, які падштурхнуў абедзьве дзяржавы да актывізацыі інтэграцыі, сталася ваенная аперацыя НАТО на Балканах. У расійскім грамадзтве ўзмацнілася пачуцьцё небясьпекі, якое суправаджалася нарастаньнем антызаходніх настрояў.

Аб неабходнасьці паскарэньня палітычнай, вайскова-палітычнай і эканамічнай інтэграцыі зь Беларусяй гаварылася і ў заяве РВАП па Югаславіі, якую 16 красавіка 1999 г. апублікавала "Независимая газета"[46].

У кастрычніку 1999 г. "Независимая газета" апублікавала тэзысы РВАП "О российско-белорусской интеграции". Складальнікі тэзысаў крытыкавалі пазыцыю расійскага ўраду ў дачыненьні да Беларусі. "Па сутнасьці, ідзе кампрамэтацыя афіцыйнымі структурамі ідэі аб'яднаньня, якую выпакутавалі расійцы і беларусы. Рознага роду палітычныя "зьлівы", абыякавасьць, ведамасная зацыкленасьць ці работа мэханізмаў гамаваньня ствараюць вакол працы над расійска-беларускай дамовай і зьвязаным зь ёй пагадненьнямі ганебную атмасфэру", — падкрэсьлівалася ў дакумэнце[47].

Як і раней, чальцы РВАП уважалі, што інтэграцыя зь Беларусяй карысная для Расіі, адзначаючы, што з 1997 г. Беларусь і Расія зноў сталі найбуйнейшымі гандлёвымі партнэрамі — галоўным чынам на аснове непасрэдных сувязяў Беларусі з расійскімі рэгіёнамі, — зрабілі пэўныя крокі ў справе фармаваньня супольнай эканамічнай прасторы, рэалізавалі на заканадаўчым узроўні роўнасьць правоў грамадзянаў Саюзу ў працаўладкаваньні, аплаце працы, у атрыманьні розных відаў адукацыі, мэдычнай дапамогі. Таксама зьвярталася ўвага на факт прыняцьця канцэпцыі адзінай абароннай прасторы, супадзеньне поглядаў кіраўнікоў Расіі й Беларусі на праблемы рэгіянальнае бясьпекі, крыніцаў і характару ваенных пагрозаў.

Зыходзячы з наяўнасьці аб'ектыўных перадумоваў для збліжэньня дзьвюх дзяржаваў, складальнікі тэзысаў адзначалі, што курс на інтэграцыю павінен праводзіцца больш рашуча. "Спробы ваенна-сілавых разьвязаньняў найскладанейшых праблемаў міжнароднай палітыкі, што адбываецца сёньня ў Югаславіі, ствараюць зусім іншае інэрцыйнае поле далейшага збліжэньня Расіі й Беларусі. Калі дагэтуль можна было гаварыць аб паступовым вырашэньні пытаньня аб саюзе дзьвюх краінаў, іх марудным і паэтапным збліжэньні, то ў цяперашні момант працэс яднаньня павінен быць фарсаваны", — пісалі яны[48].

Аўтары тэзысаў, як і ў 1997 г., лічылі, што аптымальнай формай яднаньня Расіі й Беларусі ёсьць канфэдэрацыя з адзінай валютай. У кампэтэнцыю Саюзнае дзяржавы яны прапаноўвалі перадаць пытаньні адзінай валюты, адзінага грамадзянства, арганізацыі найвышэйшых органаў улады, рэгуляваньне гандлю, сумеснае разьвіцьцё транспарту і камунікацыяў. Чальцы РВАП выступалі за наданьне Саюзнай дзяржаве статусу суб'екту міжнароднага права, увядзеньне саюзнага грамадзянства, стварэньне наднацыянальных органаў, пастановы якіх павінны былі прымацца да апэратыўнага выкананьня органамі ўлады ў Расіі й Беларусі. Таксама яны ўважалі мэтазгодным утварэньне саюзнага парлямэнту з наданьнем яму права зацьвярджаць старшыню ўраду Саюзу, уплываць на выпрацоўку асноваў палітыкі Саюзу і дзейнасьць органаў Саюзу, а таксама гарантыі першачарговага разгляду заканадаўчых ініцыятываў Саюзнага парлямэнту нацыянальнымі парлямэнтамі Расіі й Беларусі. Разам з тым чальцы РВАП выступалі супраць увядзеньня пасады прэзыдэнта Саюзу, разглядаючы адпаведную прапанову як непрымальную на гэтым этапе дзяржаўнага разьвіцьця Расіі й Беларусі[49].

У заключнай частцы тэзысаў гаварылася: "Інтэграцыя Расіі й Беларусі ўяўляе сабой выразнае і зусім зразумелае ўвасабленьне ідэі стварэньня на рэштках постсавецкай прасторы новага дзяржаўнага ўтварэньня зь яго ўласнымі палітыкай, эканомікай, ідэалёгіяй і нацыянальна-культурным фэномэнам. У гістарычным пляне Расія ўпершыню за апошняе дзесяцігодзьдзе мае шанец перайсьці з рэактыўнай схемы паводзінаў у справах СНД да актыўнай, ствральнай палітыкі, а Беларусь выступае ў авангардзе інтэграцыйных працэсаў. Сёньня ўмацаваньне адзінства нашых краінаў можа расцэньвацца як гістарычны шанец выжываньня цэльнай… цывілізацыі. Ня выкарыстаць яго было б злачынствам перад памяцьцю нашых дзядоў і перад нашымі нашчадкамі"[50].

8 сьнежня 1999 г. прэзыдэнты Расіі й Беларусі падпісалі ў Крамлі Дамову аб стварэньні Саюзнай дзяржавы і Праграму дзеяньняў па рэалізацыі палажэньняў Дамовы. У момант падпісаньня Б. Ельцын казаў: "У XXI стагодзьдзе нашы краіны ўступаюць у новай якасьці... Мы не імкнёмся да нейкіх кан'юнктурных палітычных меркаваньняў. Саюзная дзяржава ствараецца на базе сувэрэнітэту і незалежнасьці краінаў-удзельніцаў і не накіравана супраць каго б там ні было"[51].

У 2000 г., пасьля сыходу Ельцына, новая крамлёўская адміністрацыя працягнула курс на інтэграцыю зь Беларусяй. У новай рэдакцыі Канцэпцыі вонкавай палітыкі Расійскай Фэдэрацыі было запісана, што ўмацаваньне Саюзу Беларусі й Расіі як найвышэйшай на гэтым этапе формы інтэграцыі дзьвюх сувэрэнных дзяржаваў ёсьць першачарговай задачай расійскай дыпляматыі[52].

У лютым 2000 г. расійскае і беларускае міністэрствы замежных справаў правялі ў Менску першую сумесную калегію, дзе разгледзелі практычныя аспэкты каардынацыі дзейнасьці двух ведамстваў. Адным з галоўных вынікаў паседжаньня стала падпісаньне Праграмы ўзгодненых дзеяньняў у сфэры вонкавай палітыкі на 2000—2001 гг. У прынятым дакумэнце гаварылася, што вонкавапалітычныя ведамствы дзьвюх краінаў спрыяцьмуць:

— дасягненьню мэтаў і прынцыпаў Саюзнай дзяржавы;
— прыняцьцю мераў што да аб'яднаньня матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялу дзяржаваў — удзельніцаў Саюзнай дзяржавы ў мэтах забесьпячэньня роўнасьці правоў і асноўных свабодаў грамадзянаў Саюзнай дзяржавы, эфэктыўнага функцыянаваньня адзінай эканамічнай, мытнай, інвэстыцыйнай, абароннай, прававой, навукова-тэхналягічнай і інфармацыйнай прасторы, аб'яднаных транспартнай і энэргетычных сыстэмаў;
— рэалізацыі мэтаў і задач разьвіцьця інтэграцыі ў абсягу сумеснай абароннай і памежнай палітыкі, вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва, барацьбы зь незаконным абарачэньнем наркотыкаў, арганізаванай злачыннасьцю, міжнародным тэрарызмам і іншымі відамі злачыннасьці;
— збліжэньню нацыянальных прававых сыстэмаў[53].

27 чэрвеня 2000 г. "Праграма ўзгодненых дзеяньняў у абсягу вонкавае палітыкі" была зацьверджаная Найвышэйшай Дзяржаўнай Радай Саюзнай дзяржавы.

У 1996—2001 гг. расійская дыпляматыя аказвала беларускаму рэжыму падтрымку ў эўрапейскіх і іншых міжнародных структурах (ААН, АБСЭ, Рада Эўропы), хаця істотных посьпехаў у справе вываду Беларусі зь міжнароднай ізаляцыі не дасягнула. Павышаную ўвагу Расія і Беларусь надавалі каардынацыі дзеяньняў з мэтаю сынхроннага далучэньня да Сусьветнай гандлёвай арганізацыі ў якасьці самастойных суб'ектаў міжнароднага права. У сваю чаргу, Беларусь падтрымлівала Расію што да вайсковай апэрацыі ў Чачні і ў справе захаваньня Дамовы па СРА.

Новы расійскі прэзыдэнт У. Пуцін быў прыхільнікам збліжэньня зь Беларусяй. Сваю пазыцыю што да інтэграцыі ён выразна патлумачыў у кастрычніку 2001 г.: "Ёсьць вялікае імкненьне насельніцтва абедзьвюх краінаў... да стварэньня нейкіх сумесных дзяржаўных структураў. І не лічыцца з гэтым было б проста неабачліва. Беларускі і расійскі народы этнічна вельмі блізкія па культуры, па мове, у іх супольная гісторыя ў значнай ступені, узаемныя вялікія сымпатыі"[54]. Адпаведную думку ён выказаў і на паседжаньні Найвышэйшай Дзяржаўнай Рады Саюзнай дзяржавы 26 сьнежня 2001 г., зьвярнуўшы ўвагу на тое, што інтэграцыя паміж Расіяй і Беларусяй ёсьць "ня проста слушным, але і адзіна магчы-

мым шляхам”[55]. Разам з тым яшчэ ў чэрвені 2000 г. ён зьвярнуў увагу на тое, што дзейснасьць “саюзнай дзяржавы” павінна вызначацца ня колькасьцю прынятых дакумэнтаў, а рэальнымі пастановамі, накіраванымі на стварэньне Саюзнай дзяржавы[56]. Таксама расійскі прэзыдэнт падкрэсьліў, што ўзгадненьне дзеяньняў паміж Расіяй і Беларусяй на міжнароднай арэне не прадугледжвае фармаваньня адзінай вонкавай палітыкі дзьвюх краінаў. “Паводле дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы, і Расія, і Беларусь захоўваюць сувэрэнітэт, а значыцца, пакідаюць за сабой права мець свае меркаваньне ў шэрагу праблемаў”, — заўважыў ён[57].

У сьнежні 2001 г. У. Пуцін выказаў думку, што “посьпех расійска-беларускай інтэграцыі — у яе сыстэмнасьці й пасьлядоўнасьці. “Важна ня страчваць узятага тэмпу і не спрабаваць пераскочыць цераз аб’ектыўныя ступені. Толькі дакладна ўзважаныя і ўзгодненыя падыходы дазволяць нам эфэктыўна рэалізаваць вызначаныя пляны, дапамогуць разьвязаць любыя пытаньні, якія ўзьнікаюць у ходзе інтэграцыйных працэсаў”, — падкрэсьліў ён[58]. Падобныя падыходы выказвалі й іншыя вышэйшыя службовыя асобы Расіі. Так, міністар замежных справаў РФ Ігар Іваноў у студзені 2001 г. на паседжаньні Кансультацыйнай рады суб’ектаў РФ у міжнародных і вонкаваэканамічных сувязях пры МЗС РФ заявіў, што аб’яднаньне зь Беларусяй ня ёсьць самамэтай для Расіі й саюз зь Беларусяй ёй патрэбны “не на паперы, а ў рэальным жыцьці”[59].

У 2001 г. расійскі бок рашуча адкінуў прапановы беларускага кіраўніцтва што да стварэньня наднацыянальных саюзных органаў, зрабіўшы ціск на неабходнасьці радыкальнейшых крокаў у эканаміцы. “Сёньня адна з нашых прыярытэтных задач — выпрацоўка адзінай эканамічнай палітыкі. І перш за ўсё, фармаваньне супольнай эканамічнай і мытнай прасторы”, — казаў У. Пуцін у сьнежні 2001 г.[60]. На яго думку, ключавымі пытаньнямі інтэграцыі павінны былі стаць уніфікацыя тарыфаў і падатковай сыстэмы Расіі й Беларусі, урэгуляваньне пытаньняў уласнасьці Саюзнай дзяржавы, супрацоўніцтва ў сфэры абароны, аховы працы, сацыяльнай абароны насельніцтва[61]. На паседжаньні Найвышэйшай Дзяржаўнай Рады 26 сьнежня 2001 г. расійскі кіраўнік падкрэсьліў, што мае абмеркаваць плян сумесных дзеяньняў для фармаваньня адзінай эканамічнай прасторы, канцэптуальныя асновы, прагнозы й ацэнкі сацыяльнага разьвіцьця і вайсковую дактрыну Саюзнай дзяржавы, а не пытаньне аб стварэньні саюзных органаў улады[62]. І. Іваноў у студзені 2001 г. цьвердзіў, што базысам расійска-беларускай інтэграцыі ёсьць эканамічныя, культурныя, грамадзкія сувязі, кантакты паміж людзьмі, і зьвяртаў увагу на неабходнасьць разьвіцьця міжрэгіянальных сувязяў у сфэры эканомікі, культуры, адукацыі, гуманітарнай сфэры[63].

Аб неабходнасьці зьменаў у расійска-беларускіх адносінах загаварылі і расійскія спэцыялісты-міжнароднікі. Напрыклад, прэзыдэнт РВАП Сяргей Караганаў у лютым 2002 г. заявіў: “Беларусь на Захадзе ўспрымаецца нэгатыўна. Але для Расіі Беларусь мае стратэгічны інтарэс, і нам трэба ісьці ня толькі на адзіную валюту, але і настойваць на тым, каб Беларусь пайшла на мадэрнізацыю





свайго эканамічнага і палітычнага жыцьця. Зразумела, мы хочам, каб гэта было зроблена пры кардынальным удзеле Расіі, з тым, каб праз 5-6 гадоў Беларусь не пачала распадацца. Для гэтага трэба мець асобную, вельмі энэргічную беларускую палітыку”[64].

Такім чынам, расійская палітыка ў дачыненьні да Беларусі знаходзілася ў цеснай сувязі з агульнай палітыкай Расіі што да СНД. Дакумэнтальна афармленай і зацьверджанай дактрыны разьвіцьця адносінаў зь Беларусяй расійскае кіраўніцтва ня мела, таму расійска-беларуская інтэграцыя праходзіла спантанна (хаця спробы вызначыць дактрынальныя асновы палітыкі ў дачыненні да Беларусі расійскімі інтэлектуаламі рабіліся). Ідучы на збліжэньне зь Беларусяй, расійскія кіраўнікі не хацелі абмяжоўваць дзяржаўнага сувэрэнітэту Расійскай Федэрацыі й ствараць нейкае міждзяржаўнае ўтварэньне на “пачэсных” для Беларусі ўмовах, што прыводзіла да выкастраваньня інтэграцыйнай ідэі.

У 1990-х гадох вырашальны ўплыў на інтэграцыю Расіі зь Беларусяй аказвалі геапалітычныя чыньнікі (эканамічныя і вайсковыя фактары мелі выразна другарадны характар). У 1997 г. расійскае кіраўніцтва і спэцыялісты-міжнароднікі з захапленьнем паставіліся да інтэграцыі зь Беларусяй, разглядаючы яго як сродак вяртаньня “велічы” Расіі й прарыву “дыпляматычнай ізаляцыі”. У далейшым яны ставіліся да збліжэньня зь Беларусяй асьцярожней. Вартасьць інтэграцыі зь Беларусяй у вачах расійскіх кіраўнікоў пачала зьніжацца, хаця цалкам ад ідэі інтэграцыі яны не адмовіліся, разглядаючы яе як пасьпяховы прыклад рэінтэграцыі постсавецкай прасторы. Расійскае кіраўніцтва разглядае Беларусь як краіну-кліента, якую лепш падтрымліваць, чым згубіць.

---

1 Московские новости. 1991. № 3. 20 янв. С. 4.
2 Зенькович Н. Сочинения. Т. 1. М., 2000. С. 532.
3 Ельцин Б.Н. Записки президента. М., 1994. С. 151.
4 Московские новости. 1991. № 50. 15 декабря. С. 4.
5 Независимая газета. 1992. 19 августа.
6 Тамсама.
7 Тамсама.
8 Международная жизнь. 1993. № 1. С. 19.
9 Внешняя политика Российской Федерации. М., 2000. С. 97—98.
10 Тамсама. С. 98—99.
11 Независимая газета. 1994. 27 мая.
12 Тамсама.
13 Тамсама.
14 Дипломатический вестник. 1995. № 10. С. 3.
15 Тамсама. С. 5.
16 Тамсама. С. 6.
17 К единому государству: о создании российско-белорусского Союзного государства / Под

ред. Г.В. Осипова и С.Н. Бабурина. М., 2001. С. 293.
[18] Независимая газета. 1996. 23 мая.
[19] Внешняя политика Российской Федерации. С. 109.
[20] Внешняя политика Российской Федерации. С. 109—110; Национальная и региональная безопасность. Мн., 2001. С. 296.
[21] Иванов И.С. Новая российская дипломатия. Десять лет внешней политики страны. М., 2002. С. 223.
[22] Тамсама. С. 223—224.
[23] Дипломатический вестник. 2001. № 2. С. 11.
[24] Дипломатический вестник. 1993. Спец. выпуск. С. 9—13.
[25] Независимая газета. 1992. 30 ліпеня.
[26] Тамсама.
[27] Независимая газета. 1992. 19 жніўня.
[28] Независимая газета. 1993. 17 жніўня.
[29] Независимая газета. 1994. 18 студзеня.
[30] Тамсама.
[31] Независимая газета. 1994. 27 мая.
[32] Независимая газета. 1996. 23 мая.
[33] Тамсама.
[34] Независимая газета. 1996. 19 сьнежня.
[35] Тамсама.
[36] Известия. 1997. 12 мая.
[37] Независимая газета. 1997. 29 красавіка.
[38] Тамсама.
[39] Тамсама.
[40] Тамсама.
[41] Тамсама.
[42] Тамсама.
[43] Ельцин Б.Н. Президентский марафон: Размышления, воспоминания, впечатления. М., 2000. С. 184—185.
[44] Тамсама. С. 186.
[45] Независимая газета. 1999. 31 сакавіка.
[46] Независимая газета. 1999. 16 красавіка.
[47] Независимая газета. 1999. 1 кастрычніка.
[48] Тамсама.
[49] Тамсама.
[50] Тамсама.
[51] Дипломатический вестник. 2000. № 1. С. 27.
[52] Иванов И.С. Новая российская дипломатия. С. 223.
[53] Дипломатический вестник. 2000. № 3. С. 25.
[54] Аргументы и факты. 2001.№ 46. С. 3.
[55] Дипломатический вестник. 2002. № 1. С. 72.
[56] Рэспубліка. 2000. 28 чэрвеня.
[57] Белорусский рынок. 2000. № 26. 4—9 ліпеня. С. 5.
[58] Дипломатический вестник. 2002. № 1. С. 72.
[59] Дипломатический вестник. 2001. № 1. С. 53.
[60] Дипломатический вестник. 2002. № 1. С. 72.





[61] Тамсама.
[62] Тамсама.
[63] Дипломатический вестник. 2001. № 1. С. 54—55.
[64] Независимая газета. 2002. 28 лютага.